Версія дакумента: сакавік 2026

# Тлумачэнне да конкурсу прапаноў: ArtPower Belarus. Захаванне грамадзянскай прасторы Беларусі праз культуру і мастацтва


Тыпы падтрымання і тэрміны 2
Уводзіны і агульная інфармацыя 3
Крытэры адпаведнасці 4
Крытэрыі выключэння 6
Партнёрства 7
Умовы фінансавання і абмежаванні 7
Мэты конкурсу 8
Трэк 1. Гранты на арганізацыйнае развіццё 9
Трэк 2. Гранты на творчыя праекты 10
Трэк 3. Гранты на праекты ў асаблівых абставінах 12
Ацэнка і адбор заявак 14
Як падаць заяўку 15
Спіс суправаджальных дакументаў 15
Механізмы фінансавага падтрымання 16
Бачнасць праекту 19
Падтрыманне заяўнікаў 19
Бяспека 19
Ахова персанальных звестак і выкарыстанне вынікаў праекту 20

# Тыпы падтрымання і тэрміны

| | *Трэк 1. Гранты на арганізацыйнае развіццё* | *Трэк 2. Гранты на творчыя праекты (міні)* | *Трэк 2. Гранты на творчыя праекты (мідзі)* | *Трэк 3. Гранты на праекты ў асаблівых абставінах* |
|---|---|---|---|---|
| *Мінімальная сума гранту* | € 10 000 | € 3000 | € 10 000 | € 1000 |
| *Максімальная сума гранту* | € 40 000 | € 10 000 | € 40 000 | € 5 000 |
| *Магчымасць павелічэння сумы* | Да € 60 000:<br><br>Праект рэалізуецца ў партнёрстве дзвюх ці больш арганізацыяў<br><br>Дзейнасць праекту адбываецца ў дзвюх ці больш краінах | X | Да € 60 000:<br><br>Праект рэалізуецца ў партнёрстве<br><br>Дзейнасць праекту адбываецца ў дзвюх ці больш краінах<br><br>Агульны бюджэт праекта перавышае суму € 60 000, пры гэтым заяўнік ужо мае не менш за 20% агульнай сумы, падтрыманай іншым грантам | Да € 10 000:<br><br>Калектыўная тэрміновая мабільнасць<br><br>Сумесны праект аўтараў ва ўразлівым становішчы<br><br>Страта фінансавання |
| *Дадатковыя дакументы* | Ацэнка і план арганізацыйнага развіцця | X | X | Доказы тэрміновасці запыту |
| *Запыт на ментарскае падтрыманне* | info@artpowergrants.org тэма "Запыт на ментарства Трэк 1" | X | X | X |
| *Апошні тэрмін запыту на ментарынг* | 28.04.2026 | X | X | X |
| *Пачатак прыёму заявак* | 17.03.2026 | Не раней за красавік 2026 | Не раней за красавік 2026 | На сталай аснове |
| *Апошні тэрмін падачы заявак* | 12.05.2026 | Будзе абноўлена | Будзе абноўлена | На сталай аснове |
| *Абвяшчэнне вынікаў* | Не пазней за 10.07.2026 | Будзе абноўлена | Будзе абноўлена | На сталай аснове |
| *Пачатак рэалізацыі праекта* | Не раней за 01.09.2026 | Будзе абноўлена | Будзе абноўлена | Не раней за 5 тыдняў пасля падачы |
| *Канец рэалізацыі праекта* | Не пазней за 31.08.2027 | Будзе абноўлена | Будзе абноўлена | X |
| *Працягласць праектаў* | 3–12 месяцаў | 1–6 месяцаў | 3–12 месяцаў | 1–12 месяцаў |

## Уводзіны і агульная інфармацыя

Гэты конкурс праектавых прапановаў — ключавы кампанент праграмы “ArtPower Belarus: Захаванне грамадзянскай прасторы Беларусі праз культуру і мастацтва”, якая фінансуецца Еўрапейскім Саюзам (ЕС) і рэалізуецца Дацкім інстытутам культуры ў партнёрстве з Беларускаю Радаю культуры.

Мэта праграмы — падтрымаць незалежныя беларускія культурніцкія і мастацкія ініцыятывы праз умацаванне іх ролі і патэнцыялу як рухавікоў дэмакратычных пераменаў.

*Звярніце ўвагу, што гэтая праграма рэалізуецца пры падтрымцы ЕС для шырокага кола арганізацый і ініцыятыў грамадзянскай супольнасці (як зарэгістраваных, так і незарэгістраваных), якія дзейнічаюць у сферы культуры ў Беларусі або за мяжой. З-за шырокасці і складанасці геаграфіі праграмы могуць узнікнуць разыходжанні паміж юрыдычнымі тлумачэннямі розных тэрмінаў у мясцовым заканадаўстве заяўнікаў. Для мэтаў гэтай праграмы азначэнні, выкладзеныя ў гэтым дакуменце, маюць перавагу над любымі афіцыйнымі мясцовымі юрыдычнымі азначэннямі.*

*Калі вы маеце пытанні адносна таго, як пэўны тэрмін можа быць інтэрпрэтаваны ў рамках гэтага конкурсу праектных прапаноў, звярніцеся да арганізатараў для ўдакладнення.*

**У межах конкурсу асаблівая ўвага будзе надавацца праектам, што адпавядаюць наступным прыярытэтам:**

*1. Спрыянне цэласнасці культурніцкай прасторы Беларусі:*

- Праекты, створаныя аўтарамі, што жывуць у Беларусі або арыентуюцца на беларускую аўдыторыю ўнутры краіны — нават ва ўмовах існуючых выклікаў.
- Ініцыятывы, у якіх удзельнічаюць аўтары і эксперты з Беларусі, нават калі асноўная частка праекта рэалізуецца за мяжой.
- Праекты, што маюць выключную каштоўнасць для беларускай культуры.[1]

*2. Павышэнне якасці і бачнасці культурніцкіх прадуктаў, паляпшэнне ўмоваў працы культурніцкіх актараў і іх інтэграцыі ў еўрапейскую прастору:*

- Адукацыйныя праграмы і ініцыятывы па павышэнні прафесійных навыкаў у сферы культуры, а таксама даследчыя праекты.
- Развіццё прафесійных і міжсектаральных сетак, міжнароднае супрацоўніцтва і абмен досведам.

---

1 Праект мае выключную каштоўнасць для беларускай культуры, калі яго прадукт(ы) з’яўляецца агульнадасяжным для кожнага беларуса, незалежна ад яго геаграфічнага становішча, і аднолькава значным для любога беларуса як асобы, якая імкнецца захаваць і развіваць сваю культурную ідэнтычнасць. Пры гэтым прадукт(ы) праекта мае доўгатэрміновую вартасць: ён застанецца ў гісторыі як сведчанне часу і культурнай творчасці і зможа быць карысным будучым пакаленням праз гады і дзесяцігоддзі.

- Асветніцкія і адукацыйныя праекты, скіраваныя на дзяцей і моладзь або рэалізаваныя імі.
- Адвакацыйныя і інфармацыйныя кампаніі, а таксама новыя формы прасоўвання беларускай культуры.
- Інавацыйныя прадукты, што садзейнічаюць развіццю культурнага сектара.

*3. Развіццё інстытуцый і інфраструктуры:*

- Падтрымка праектаў, якія ўмацоўваюць незалежныя культурныя інстытуцыі і сеткі і спрыяюць устойліваму развіццю сектара.

## Крытэры адпаведнасці

Браць удзел у конкурсе могуць суб’екты культуры і мастацтва: фізічныя асобы, а таксама арганізацыі ды ініцыятывы грамадзянскае супольнасці (зарэгістраваныя і не) у сферы культуры ў Беларусі ці за яе межамі, дзейнасць якіх у большай ступені рэалізуецца ў Беларусі ці для аўдыторыі ў Беларусі — далей Заяўнік.

### Культурныя сектары, якія падтрымліваюцца праграмай:

- Перфарматыўныя мастацтвы (Тэатр, харэаграфія, музычныя і мультыжанравыя перформансы і канцэрты, вулічнае і цыркавое мастацтва, харавое мастацтва)
- Кіна- і тэлевізійнае мастацтва (Стварэнне фільмаў, дакументальных, мастацкіх, анімацыйных, тэлевізійных праграм, серыялаў — ад сцэнара да экрана)
- Музыка і аўдыёмастацтва (Запіс музыкі розных жанраў, стварэнне музычных твораў і гукавых інсталяцый, запіс музычных лайваў)
- Новыя медыя і прасоўванне культуры (Лічбавыя платформы, інфармацыйныя рэсурсы, ютуб-каналы, відэапрадукцыя, медыя праекты, стварэнне падкастаў, радыё праграм, культурная журналістыка і прамоцыя, а таксама інтэрактыўныя гульні, мабільныя прыкладанні і новыя фарматы распаўсюджвання сэнсаў)
- Візуальныя мастацтвы і дызайн (Жывапіс, скульптура, фатаграфія, выставачная дзейнасць, фотаальбомы, дыгітальнае мастацтва і дызайн, інсталяцыі)
- Літаратура і выдавецкая справа (Творчасць слова: напісанне, рэдагаванне, пераклады, выданне кніг, удзел у кніжных кірмашах і фестывалях, распаўсюд літаратуры)
- Спадчына і традыцыйная культура (Ахова матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны: фальклор, рамёствы, кулінарная культура, архітэктура — усё, што захоўвае жывую сувязь з каранямі)
- Адукацыя, асвета і даследаванні ў культуры (Адукацыйныя ініцыятывы, павышэнне кваліфікацыі, культурная аналітыка, архівацыя, правядзенне даследаванняў, музейная справа, адукацыйныя і асветніцкія праекты для дзяцей і моладзі)
- Менеджмент культурніцкіх падзей (Арганізацыя і куратарства выставаў, фестываляў, узнагарод, імпрэзаў, мастацкіх рэзідэнцый, правядзенне святаў, міжнародных акцый)

- Супольнасці і прафесійныя аб'яднанні (Стварэнне і дзейнасць супольнасцяў, прафесійных сетак і аб'яднанняў, развіццё нетворкінгу, наладжванне партнёрстваў, абмену вопытам і агульнага прадстаўніцтва інтарэсаў, адвакацыйная дзейнасць)

*Калі ідэя вашага праекта адносіцца да двух ці больш сектараў, калі ласка, выберыце асноўны сектар пры запаўненні формы заяўкі на партале. Больш падрабязную інфармацыю глядзіце ў раздзеле «Як падаць заяўку» ніжэй.*

## Хто можа падаць заяўку

**Фізічныя асобы** — творцы і культурніцкія дзеячы, чыя дзейнасць пераважна адбываецца ў Беларусі або для аўдыторыі ў Беларусі:

- дасягнулі 18 гадоў на момант падачы заяўкі;
- прафесійна дзеюць у беларускай культурніцкай і/або крэатыўнай сферы;
- індывідуальныя заяўнікі мусяць мець банкаўскі рахунак у краінах ЕС[2] ці ў бяспечных краінах Усходняга партнёрства[3];
- звярніце ўвагу, што прыватныя асобы, у тым ліку прыватныя прадпрымальнікі, могуць падаваць заяўкі на падтрымку, якая не перавышае 10 000 еўра на адну заяўку.

**Арганізацыі ды ініцыятывы грамадзянскае супольнасці** ў сферы культуры (у Беларусі, краінах ЕС або Усходняга партнёрства)

а) Зарэгістраваныя арганізацыі ці ініцыятывы за межамі Беларусі:

- асноўная дзейнасць ажыццяўляецца ў культурніцкай і/або крэатыўнай сферы ў Беларусі, краінах ЕС або краінах Усходняга партнёрства, і скіраваная на падтрыманне грамадзянаў або грамадзянскае супольнасці Беларусі;
- арганізацыі мусіць мець банкаўскі рахунак у краіне ЕС або ў бяспечнай краіне Усходняга партнёрства, а таксама сістэму фінансавага кіравання для забеспячэння належнае справаздачнасці і кантролю сродкаў.

б) Незарэгістраваныя арганізацыі ці ініцыятывы за межамі Беларусі:

- асноўная дзейнасць ажыццяўляецца ў культурным і/або крэатыўным сектары ў Беларусі краінах ЕС або Усходняга партнёрства, і накіравана на падтрымку грамадзян Беларусі або грамадзянскай супольнасці;
- калі падаюць заяўку на падтрымку ў памерах больш за 10 000 еўра, павінны мець фіскальнага партнёра (гл. раздзел "Фіскальны партнёр" ніжэй).
- павінны мець банкаўскі рахунак у краіне ЕС або ў бяспечнай краіне Усходняга партнёрства

---

2 Аўстрыя, Балгарыя, Бельгія, Венгрыя, Германія, Грэцыя, Данія, Ірландыя, Іспанія, Італія, Кіпр, Латвія, Літва, Люксембург, Мальта, Нідэрланды, Партугалія, Польшча, Румынія, Славакія, Славенія, Фінляндыя, Францыя, Харватыя, Швецыя, Эстонія

3 Азербайджан, Арменія, Грузія, Малдова, Украіна

в) Зарэгістраваныя і незарэгістраваныя арганізацыі ці ініцыятывы ўнутры Беларусі:

- асноўная дзейнасць ажыццяўляецца ў культурным і/або крэатыўным сектары ў Беларусі і накіравана на падтрымку грамадзян Беларусі або грамадзянскай супольнасці;
- калі падаюць заяўку на падтрымку ў памерах больш за 10 000 еўра, павінны мець фіскальнага партнёра (гл. раздзел “Фіскальны партнёр” ніжэй)[4];
- калі падаюць заяўку на падтрымку ў памеры, якія не перавышае 10 000 еўра, павінны мець банкаўскі рахунак у краіне ЕС або ў бяспечнай краіне Усходняга партнёрства

## Крытэрыі выключэння

Заяўнік не дапускаецца да ўдзелу, калі ён адпавядае аднаму або некалькім з наступных крытэрыяў:

- З’яўляецца банкрутам, знаходзіцца ў стане неплацежаздольнасці або ў працэсе ліквідацыі, з актывамі, якія знаходзяцца ў стадыі ліквідацыі;
- Канчатковым рашэннем суда або адміністрацыйным рашэннем прызнана, што заяўнік не выканаў абавязацельствы па выплаце падаткаў або ўзносаў на сацыяльнае забеспячэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам краіны, у якой зарэгістравана арганізацыя, дзе пражывае ўпаўнаважаны прадстаўнік, або краіны, дзе будзе рэалізаваны грант;
- Канчатковым рашэннем суда або адміністрацыйным рашэннем прызнана, што заяўнік здзейсніў сур’ёзныя прафесійныя парушэнні, згодна з дзеючымі законамі, правіламі або этычнымі стандартамі прафесіі заяўніка, або займаецца любой незаконнай дзейнасцю, якая ўплывае на яго прафесійную сумленнасць;
- Прадэманстраваў істотныя недахопы ў выкананні асноўных абавязацельстваў па кантракце, пагадненні аб гранце або рашэнні аб гранце, што фінансуюцца Еўрапейскім Саюзам;
  Мае асабістую або прафесійную сувязь (напрыклад, член сям’і або калега) з чальцамі адборачнай або ацэначнай камісіі.

## Адмова ў прысуджэнні гранта

Заяўніку будзе адмоўлена ў прысуджэнні гранта, калі:

- ён адпавядае аднаму або некалькім крытэрыям выключэння;
- ён падаў скажоную або ўтоіў інфармацыю, неабходную для ўдзелу ў конкурсе;
- ён удзельнічаў у падрыхтоўцы конкурса прапаноў.

---

4 У выключных выпадках, калі ёсць важкія падставы, банкаўскага рахунку ў краіне ЕС або ў бяспечнай краіне Усходняга партнёрства можа быць дастаткова пры заяўцы на сумы вышэй за 10 000 еўра.

## Партнёрства

Заяўкі могуць падавацца індывідуальна або ў партнёрстве. У выпадку партнёрства адна фізічная або юрыдычная асоба павінна выступаць у ролі вядучага заяўніка, а другая - у ролі сузаяўніка (партнёра). Вядучы заяўнік і ягоныя партнёры могуць браць удзел у іншых праектах у якасці партнёраў.

Звяртаем увагу: падчас падачы заяўкі неабходна падаць суправаджальную дакументацыю (рэзюмэ, партфоліа і інш.), а таксама падпісаны Мандат партнёра, які пацвярджае намер супрацоўніцтва ў межах праекта.

*Звярніце ўвагу, што партнёрская дзейнасць прадугледжвае актыўны ўдзел* ***абодвух*** *партнёраў у рэалізацыі праектных мерапрыемстваў. У выпадках, калі адна з арганізацый адказвае толькі за атрыманне сродкаў і кіраванне плацяжамі, гэта не лічыцца партнёрскім праектам. У такіх выпадках адна з арганізацый выконвае абавязкі фіскальнага партнёра і кіруе атрыманымі сродкамі, але не ўдзельнічае непасрэдна ў рэалізацыі праектных дзейнасцяў.*

### Фіскальны партнёр

Фіскальным партнёрам праекта можа стаць арганізацыя, якая мае банкаўскі рахунак у краіне ЕС або ў бяспечнай краіне Усходняга партнёрства, а таксама структуру фінансавага кіравання для забеспячэння належнае справаздачнасці і кантролю сродкаў.

Ва ўсіх выпадках фіскальны партнёр павінен быць зарэгістраванай юрыдычнай асобай з усімі неабходнымі магчымасцямі для кіравання грантавымі сродкамі (прыватныя асобы і прыватныя прадпрымальнікі не могуць выступаць у якасці фінансавых партнёраў на сумы, якія перавышаюць 10 000 еўра). Звярніце ўвагу, што падпісанае Пагадненне аб супрацоўніцтве павінна быць пададзена разам з заяўкай.

У выпадках, калі праект рэалізуецца ў партнёрстве, і партнёр таксама выконвае функцыю фіскальнага партнёра, то абодва дакументы, Мандат партнёра і Пагадненне аб супрацоўніцтве, павінны быць пададзены разам з заяўкай.

## Умовы фінансавання і абмежаванні

1. Паводле правілаў ЕС датычна фінансавання трэціх асоб, ніводная група, арганізацыя, праект або асоба не можа атрымаць у сукупнасці больш за 60 000 еўра на працягу ўсяго тэрміну рэалізацыі бягучай эдыцыі праграмы ArtPower Belarus у межах усіх колаў і ўсіх трох фінансавых трэкаў.
Гэтае правіла прымяняецца сукупна да ўсіх **афіляваных суб'ектаў**. Суб'ект лічыцца афіляваным з арганізацыяй, калі паміж імі існуе структурная сувязь, якая не абмяжоўваецца межамі праекта і існуе незалежна ад гранта. Такая афіляваная сувязь уключае, але не абмяжоўваецца наступнымі формамі:

**Капітал.** Адносіны кантролю, у тым ліку паміж узаемазвязанымі кампаніямі, якія належаць адной і той жа кантралюючай (холдынгавай) структуры.

**Кіраўніцтва.** Арганізацыі, якія кіруюцца або фактычна кантралююцца аднымі і тымі ж асобамі або органамі кіравання. Гэта, у прыватнасці, можа ўключаць:

- адных і тых жа асоб, якія выконваюць функцыі законных прадстаўнікоў, членаў кіруючых органаў або вышэйшага кіраўніцтва ў некалькіх арганізацыях;
- некалькі юрыдычна зарэгістраваных суб'ектаў, што дзейнічаюць у межах узгодненай або агульнай структуры кіравання

**Брэнд арганізацыі.** Сувязь, пры якой некалькі юрыдычных або фізічных асоб ажыццяўляюць дзейнасць сумесна пад адзіным брэндам або з мэтай рэалізацыі аднаго і таго ж праекта ці падобных відаў дзейнасці.

2. Падтрыманне надаецца толькі тым праектам, якія адпавядаюць агульнай мэце конкурсу, патрэбам вызначаных трэкаў падтрымання і выконваюць умовы конкурсу (гл. раздзел “Мэты конкурсу” ніжэй).

3. Адна асоба, арганізацыя або ініцыятыва можа падаць не больш за адну заяўку ў межах аднаго трэка для кожнага кола па Трэках 1 і 2. Па Трэку 3 заяўкі прымаюцца на сталай аснове, па адной заяўцы за раз.

4. Заяўнік можа быць сузаяўнікам у некалькіх праектах, пададзеных у межах аднаго трэка; аднак агульная падтрымка, прадастаўленая на працягу ўсёй праграмы, не можа перавышаць 60 000 еўра па ўсіх трох трэках фінансавання і перыядах падачы заявак.

5. Калі Заяўнік або яго партнёр (сузаяўнік) ужо рэалізуе праект у межах гэтае праграмы, новая заяўка можа быць пададзеная толькі пасля зацвярджэння фінальнае справаздачы наконт бягучага праекту.

### Не дапускаюцца да ўдзелу наступныя віды дзейнасці:

- якую ўжо фінансуе іншы грант;
- праекты, якія рэалізуюцца па-за межамі Беларусі, краінаў Еўрапейскага Саюзу або Усходняга партнёрства;
- дзейнасць, звязаная з фінансавай падтрымкай трэціх асоб (субгрантынг);
- якая дыскрымінуе паводле полу, узросту, гендарнай ідэнтычнасці, сексуальнай арыентацыі, інваліднасці, рэлігійных перакананняў або іх адсутнасці, этнічнае прыналежнасці, або месціць мову варожасці ці заклікі да гвалту.

## Мэты конкурсу

Схема фінансавага падтрымання падзеленая на тры трэкі, кожны з якіх адказвае на асобныя патрэбы ў межах беларускага культурніцкага сектару.

Трэк 1. Гранты на арганізацыйнае развіццё
Трэк 2. Гранты на творчыя праекты
Трэк 3. Гранты на праекты ў асаблівых абставінах

## Трэк 1. Гранты на арганізацыйнае развіццё

### Мэта і прыярытэты

Мэта — умацаваць патэнцыял арганізацыяў грамадзянскае супольнасці дзеля стварэння жыццяздольнай інфраструктуры незалежнае культуры.

### Прыярытэты

- Інфраструктурныя або сэрвісныя арганізацыі (хабы, прадзюсарскія цэнтры, галерэі, арт-рэзідэнцыі, медыярэсурсы, адукацыйныя цэнтры, студыі ды інш.)
- Адукацыя, сеткаванне і міжсектаральнае супрацоўніцтва
- Дзейнасць у Беларусі або спрыянне ўмацаванню цэласнасці беларускага культурнага поля і развіццю супрацоўніцтва паміж культурнымі дзеячамі ды аўдыторыяй з абодвух бакоў мяжы
- Праекты, якія маюць выключную каштоўнасць для беларускае культуры.

### Хто можа падаваць заяўкі

- зарэгістраваныя арганізацыі з актыўным банкаўскім рахункам або незарэгістраваныя арганізацыі з фіскальным партнёрам (незарэгістраваныя арганізацыі без фіскальнага партнёра не падтрымліваюцца);
- заяўнікі, якія завяршылі Ацэнку і План арганізацыйнага развіцця;
- заяўнікі, якія залучылі кампанент развіцця патэнцыялу ў заяўку;
- заяўнікі, чыя дзейнасць адпавядае вынікам Ацэнкі і Плану арганізацыйнага развіцця.

### Прымальныя віды дзейнасці:

- укараненне арганізацыйных змяненняў (распрацоўванне і ўкараненне працэдураў, унутраных палітык, публічных камунікацыяў, пабудова партнёрстваў, бяспека);
- распрацоўванне камунікацыйных інструментаў (у тым ліку карпаратыўныя сайты і акаўнты ў сацыяльных сетках);
- захады для павышэння кампетэнцыяў працаўнікоў, валанцёраў і сяброў; для прыцягнення новых сяброў або валанцёраў;
- падтрыманне арганізацыі сустрэчаў, стратэгічных сесіяў і ментарскіх праграмаў;
- стажыяванні і трэнінгі для паляпшэння функцыянавання арганізацыі, яе аперацыйнага патэнцыялу, прафілактыкі і развязання канфліктаў;
- набыццё абсталявання (існуюць абмежаванні); арэнда памяшканняў; арганізацыя аўдыту;

- асноўнае арганізацыйнае падтрыманне (персанал, офісы, абсталяванне, інфармацыйныя тэхналогіі, камунікацыйныя інструменты і г. д.) для культурніцкіх арганізацыяў, якія рэалізуюць ініцыятывы ў Беларусі або за мяжою.

**Звярніце ўвагу,** наступныя віды дзейнасці не будуць падтрымлівацца ў межах гэтага трэку:

- творчыя праекты (фільмы, канцэрты, выставы), якія не спрыяюць развіццю арганізацыі;
- разавыя імпрэзы або публічныя актыўнасці, якія з'яўляюцца часткай звычайнай дзейнасці арганізацыі, што не ўмацоўваюць арганізацыйнага патэнцыялу;
- беспасярэдняя фінансавая дапамога фізічным асобам, не звязаная з арганізацыйным развіццём.

## Ацэнка заяўкі

Кожны праект у гэтым трэку ацэньваецца паводле наступных крытэраў. Максімальная колькасць балаў – 100.

| ***Крытэр*** | ***Макс. балы*** |
|---|---|
| Адпаведнасць і актуальнасць | 15 |
| Уплыў на аўдыторыю і культуру | 15 |
| Якасць дзейнасці, вынікі праекта і маніторынг | 15 |
| Устойлівасць і ацэнка рызык | 10 |
| Бюджэт | 15 |
| Камунікацыя і распаўсюд | 10 |
| Каманда праекту, партнёрства і сеткаванне | 20 |

# Трэк 2. Гранты на творчыя праекты

## Мэты і прыярытэты

**Мэты:**

- падтрымаць стварэнне культурніцкіх прадуктаў для спрыяння свабоды выказвання і развіцця жывой і разнастайнай беларускай культуры, даступнай кожнаму (праз адукацыю, даследаванні, аналітыку культурніцкае палітыкі і міжнародную супрацу);
- спрыяць беларускаму нацыянальнаму і культурніцкаму жыццю ва ўмовах фрагментацыі інфармацыйнае прасторы краіны і дамінавання агрэсіўнае расійскае прапаганды;
- захаваць і развіваць беларускую нацыянальную культурную спадчыну як частку агульнаеўрапейскае культурнае прасторы.

**Прыярытэты:**

- Адвакацыйныя і інфармацыйныя кампаніі, а таксама новыя формы прасоўвання беларускай культуры.
- Адукацыя, сеткаванне і міжсектаральнае супрацоўніцтва.
- Дзейнасць у Беларусі або спрыянне ўмацаванню цэласнасці беларускага культурнага поля і развіццю супрацоўніцтва паміж культурнымі дзеячамі ды аўдыторыяй з абодвух бакоў мяжы.
- Асветніцкія і адукацыйныя праекты, скіраваныя на дзяцей і моладзь або рэалізаваныя імі.
- Праекты, якія маюць асаблівую каштоўнасць для беларускае культуры ў цэлым.

## Хто можа падаваць заяўкі

Для фізічных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў (фінансавая падтрымка да 10 000 еўра):

- не маладзейшыя за 18 гадоў на момант падачы заяўкі;
- прафесійная дзейнасць у сферы культуры.

Для арганізацыяў:

- ажыццяўленне асноўнае дзейнасці ў сферы культуры.

## Прымальныя віды дзейнасці:

- падтрыманне міжсектаральных ды інавацыйных мастацкіх і культурніцкіх праектаў;
- тэставанне розных мадэляў супрацы і супольнае творчасці;
- распрацоўванне рашэнняў, якія дазваляюць удзел уразлівых групаў у культурніцкім жыцці;
- распрацоўванне і распаўсюд адукацыйных і асветніцкіх матэрыялаў;
- распрацоўванне і распаўсюд дакументаў аб пытаннях культурніцкае палітыкі;
- праекты з інавацыйнымі элементамі і ўстойлівымі рашэннямі (напрыклад, сацыяльныя або тэхналагічныя інавацыі ў сферы культуры);
- адвакацыйныя і інфармацыйныя кампаніі (калі магчыма – у Беларусі і на міжнародным узроўні);
- падтрыманне каналаў распаўсюду інфармацыі і дзейнасці ў развіцці аўдыторыі;
- адукацыйныя праекты ў галіне культуры;
- развіццё культурніцкіх супольнасцяў і сетак;
- майстар-класы, лабараторыі, хакатоны, фестывалі, перформансы, канцэрты і інш.;
- вытворчасць і распаўсюд фільмаў і серыялаў;
- выданне кніг і запіс музычных альбомаў;
- праекты, якія прадугледжваюць мабільнасць мастакоў для працы, навучання, даследаванняў, супольнае вытворчасці або ўдзелу ў рэзідэнцыях ці абменных праграмах для культурніцкіх і мастацкіх спецыялістаў, а таксама спрыяюць фармаванню прафесійных сетак.

## Памер грантаў і працягласць

### Міні-праекты

### Ацэнка заяўкі

Кожная заяўка ў гэтым трэку ацэньваецца паводле наступных крытэраў. Максімальная колькасць балаў – 70.

| *Крытэр* | *Макс. балы* |
|---|---|
| Адпаведнасць і актуальнасць | 15 |
| Уплыў на аўдыторыю і культуру | 10 |
| Якасць дзейнасці, вынікі праекта і маніторынг | 10 |
| Бюджэт | 10 |
| Камунікацыя і распаўсюд | 10 |
| Каманда праекту, партнёрства і сеткаванне | 10 |
| Ацэнка рызык | 5 |

### Мідзі-праекты

### Ацэнка заяўкі

Кожная заяўка ў гэтым трэку ацэньваецца паводле наступных крытэраў. Максімальная колькасць балаў – 100.

| *Крытэр* | *Макс. балы* |
|---|---|
| Адпаведнасць і актуальнасць | 15 |
| Уплыў на аўдыторыю і культуру | 15 |
| Якасць дзейнасці, вынікі праекта і маніторынг | 15 |
| Устойлівасць і ацэнка рызык | 10 |
| Бюджэт | 15 |
| Камунікацыя і распаўсюд | 15 |
| Каманда праекту, партнёрства і сеткаванне | 15 |

# Трэк 3. Гранты на праекты ў асаблівых абставінах

## Мэты і прыярытэты

Падтрыманне рэпрэсаваных дзеячаў культуры ў іхных намаганнях аднавіць магчымасць працаваць у зменлівых умовах, а таксама тэрміновае падтрыманне культурніцкіх праектаў, што апынуліся пад пагрозаю зрыву ў звязку з асаблівымі абставінамі, як:

- рэпрэсаваныя творцы; дзеячы культуры, вызваленыя з турмы або якія мелі іншае абмежаванне волі (пры наяўнасці дакументаванага пацвярджэння рэпрэсіяў не пазней за год да падачы заяўкі на конкурс);

- страта фізічнае здольнасці працаваць (цягам апошняга году);
- аўтары, якія вымушана эміґравалі цягам апошніх 12 месяцаў;
- страта фінансавання падчас рэалізацыі праекту (не пазней як за 3 месяцы да падачы);
- тэрміновыя праекты і мабільнасці, якія не могуць быць фінансаваныя раз іншыя крыніцы і не могуць быць адкладзеныя без істотных стратаў;
- іншыя адмысловыя, дакументавана пацверджаныя абставіны.

**Увага! На этапе падачы заяўкі патрабуецца падаць адпаведную пацвярджальную дакументацыю.**

Заяўка павінна падавацца ад імя заяўніка праз яго ўласны акаунт. Калі заяўнік знаходзіцца ў Беларусі, падача можа быць ажыццёўлена даверанай асобай; у такім выпадку інфармацыя пра гэта павінна быць асобна пазначана ў заяўцы.

## Якія праекты падтрымліваюцца?

Падтрымка можа быць выкарыстаная для рэалізацыі невялікіх ініцыятыў, тэрміновых дзеянняў, мабільнасцяў (напрыклад, удзел у міжнародных імпрэзах, рэзідэнцыях, навучальных праграмах, даследаваннях), альбо завяршэння праектаў, што апынуліся пад пагрозаю зрыву. Памер фінансавання складае ад 1 000 да 10 000 еўра. Праекты могуць доўжыцца ад аднаго месяца да аднаго года. Падача адкрытая на пастаяннай аснове, а камісія збіраецца 1–2 разы на месяц у залежнасці ад колькасці заяў.

## Сума і тэрміны

- Сума гранта: € 1 000 – € 5 000 (у выключных выпадках да € 10 000[5]);
- Тэрмін рэалізацыі: ад 1 да 12 месяцаў;
- Падача: на сталай аснове;
- Адбор: 1–2 разы на месяц у залежнасці ад колькасці заявак;
- Старт праекта: не раней за 5 тыдняў ад моманту падачы заяўкі.

## Ацэнка заяўкі

Кожная заяўка ў гэтым трэку будзе ацэньвацца на падставе тэрміновасці і актуальнасці апісаных дзейнасцяў, а таксама якасці і сапраўднасці падаванай дакументацыі.

---

5 У якіх выпадках можна падавацца на суму да €10 000:
- Калектыўная тэрміновая мабільнасць — удзел 5 і больш чалавек;
- Сумесны праект некалькіх аўтараў ва ўразлівым становішчы (кожны з аўтараў мусіць прадставіць пацвярджальныя дакументы, адпаведныя аднаму ці некалькім крытэрам Трэка 3);
- Страта фінансавання падчас рэалізацыі праекта (выпадкі, у якіх была зафіксаваная дамоўленасць аб фінансаванні, пачалася рэалізацыя праекта, і фінансаванне было спынена па незалежных ад аўтара прычынах).

Ганарар аднаму аўтару не можа перавышаць € 4 000 еўра.

## Ацэнка і адбор заявак

Кожны заяўнік пройдзе працэс праверкі.

Кожная з прадстаўленых заявак будзе разгледжана на адпаведнасць наступным крытэрыям:

1. Прадастаўленне інфармацыі і пацвярджальнай дакументаў, у тым ліку, але не абмяжоўваючыся:

- Асабістыя дадзеныя;
- Адукацыя;
- Вопыт працы;
- Любая іншая адпаведная пацвярджальная дакументацыя.

2. Кандыдаты павінны валодаць прафесійнымі кампетэнцыямі, а таксама адпаведнай кваліфікацыяй, неабходнай для выканання прапанаванага праекта.

3. Кандыдат павінен падаць заяўку праз электронную грантавую сістэму з усімі пазначанымі неабходнымі дадаткамі.

Кожная заяўка будзе ацэньвацца як мінімум двума незалежнымі экспертамі ў адпаведнасці з ацэначнай табліцай (крытэрыі і балы пазначаны ў раздзелах кожнага трэка)

Трэк 3 мае спрошчаную працэдуру адбору — пасля праверкі на адпаведнасць заяўку разглядае адборачная камісія.

Адборачная камісія пакідае за сабой правы:

- даваць рэкамендацыі па паляпшэнні заяўкі;
- ініцыяваць перагляд і карэкціроўку бюджэту;
- рэкамендаваць тып фінансавання.

Па выніках разгляду заявак адборачнай камісіяй папярэдне зацверджаныя праекты могуць быць вернутыя на дапрацоўку. Канчатковае рашэнне аб падтрымцы такога праекта будзе прынята пасля таго, як заяўнік унясе адпаведныя змены ў заяўку або бюджэт.

Рашэнне аб падтрымцы пададзенага праекта з’яўляецца папярэднім да падпісання грантавай дамовы з заяўнікам. Па выніках рашэння Адборачнай камісіі, прапанаваныя бюджэты і/або дзейнасці праектаў могуць быць перагледжаныя і скарэкціраваныя. Канкрэтная дата пачатку для адабраных праектаў будзе пацверджана перад падпісаннем дамовы.

Канчатковае рашэнне залежыць ад:

- своечасовага адказа заяўніка;
- прадастаўлення ўсёй інфармацыі, неабходнай для падпісання грантавага пагаднення;
- паўнаты і дакладнасці гэтай інфармацыі.

Несвоечасовае прадастаўленне інфармацыі, адсутнасць адказаў на паведамленні, неадказанне на пытанні без папярэдняга паведамлення, а таксама прадастаўленне няпоўнай або недакладнай інфармацыі можа прывесці да адмены рашэння аб падтрымцы праекта. У такім разе сродкі будуць перанакіраваны на іншы праект.

Заяўнікі будуць праінфармаваныя аб выніках адбору на працягу двух тыдняў пасля пасяджэння адборачнай камісіі. Заяўнікі могуць звярнуцца па экспертныя каментары на працягу двух тыдняў пасля атрымання вынікаў удзелу ў конкурсе.

## Як падаць заяўку

Пасля азнаямлення з гэтымі тлумачэннямі і пацвярджэння таго, што вашая ідэя праекту адпавядае мэтам і патрабаванням конкурсу, вы можаце перайсці на старонку электроннай гранатавай сістэмы па спасылцы, каб зарэгістравацца і запоўніць адпаведную форму заяўкі.

Формы заяўкі даступныя па-беларуску і па-англійску. Вы можаце азнаёміцца з імі, а таксама спампаваць усе неабходныя дадаткі, якія трэба падаць разам з заяўкаю, на сайце Беларускае Рады культуры па спасылцы.

Каб запоўніць форму заяўкі ў сістэме, неабходна абраць адпаведны трэк падтрымання і ўнесці запытаную інфармацыю па-беларуску або па-англійску згодна з інструкцыямі або суправаджальнымі пытаннямі ў сістэме.

Звярніце ўвагу на канчатковы тэрмін падачы і пераканайцеся, што форма заяўкі і ўсе адпаведныя дадаткі былі адпраўленыя да заканчэння тэрміну. Пасля электроннае падачы заяўкі ўдзельнік атрымае аўтаматычнае пацвярджэнне пра атрыманне.

## Спіс суправаджальных дакументаў

У залежнасці ад трэку, на які вы падаяце заяўку, разам з формаю заяўкі можа спатрэбіцца падаць некаторыя з наступных суправаджальных дакументаў. Бальшыня шаблонаў даступная тут.

- Падрабязны бюджэт праекту – для Трэкаў 1 і 2 выкарыстоўвайце выключна шаблон, даступны па спасылцы.
- Мандат партнёра / пагадненні пра супрацу – калі праект уключае партнёрства або супрацу.
- Ацэнка і План арганізацыйнага развіцця.
- Стратэгічны план развіцця арганізацыі (калі даступны) або кароткі агляд планаў арганізацыі на будучыню, іншыя дакументы, якія сведчаць пра арганізацыйны патэнцыял Заяўніка.
- Рэгістрацыйныя дакументы арганізацыі.
- Дэкларацыя Заяўніка. CV (рэзюмэ).
- Партфоліа.
- Пацвярджэнне факту рэпрэсіяў (афіцыйныя дакументы, публікацыі ў медыях, заявы праваабарончых арганізацыяў).

- Пацвярджэнне вымушанай эміграцыі (калі адносіцца да выпадку).
- Дакументацыя пра страту фінансавання (калі адносіцца да выпадку).
- Лісты падтрымання (дзеля абгрунтавання тэрміновасці).

## Механізмы фінансавага падтрымання

### Стандартны тып грантавай дамовы са справаздачай на аснове выдаткаў

Бальшыня праектаў атрымае фінансаванне шляхам кампенсацыі дапушчальных выдаткаў пасля падачы фінансавых справаздачаў. Больш падрабязна пра дапушчальныя выдаткі глядзіце ніжэй.

### Дапушчальныя выдаткі:

- мусяць быць неабходнымі для рэалізацыі праекту;
- мусяць быць панесеныя ў перыяд рэалізацыі праекту;
- мусяць быць ідэнтыфікавальныя і правяральныя (дакументальна пацверджаныя – напрыклад, чэкі, рахункі-фактуры, дамовы, банкаўскія выпіскі і г. д.) ды адпавядаць дзейнаму падатковаму і сацыяльнаму заканадаўству.

Выдаткі мусяць адпавядаць запланаваным відам дзейнасці, пазначаным у бюджэце заяўкі. Да прыкладаў дапушчальных выдаткаў адносяцца: аплата працы, камандзіроўкі, абсталяванне, паслугі субпадраду. Фінансаванне ажыццяўляецца толькі згодна з зацверджаным бюджэтам праекту. Усе непрадбачаныя выдаткі падчас рэалізацыі мусяць быць загадзя ўзгодненыя з менеджарскаю камандай ArtPower Belarus.

Правяранне выдаткаў будзе праводзіцца для кожнага праекту падчас прамежкавай або фінальнай справаздачнасці фінансавым кантралёрам Дацкага інстытуту культуры або Беларускае Рады культуры.

### Недапушчальныя выдаткі

Наступныя выдаткі не могуць быць пакрытыя ў межах гэтага конкурсу:

- якія ўжо фінансуюцца іншымі праграмамі або донарамі;
- якія ўжо фінансуюцца іншымі праграмамі або донарамі;
- зборы і падаткі, у тым ліку ПДВ, калі падлягаюць вяртанню згодна з нацыянальным падатковым заканадаўствам;
- пазыкі і адсоткі па крэдытах;
- рэзервы на страты або патэнцыйныя будучыя абавязанні;
- купля зямельных участкаў або будынкаў;
- страты ад валютных курсаў;
- выдача пазык трэцім асобам;
- штрафы, пені і судовыя выдаткі, звязаныя з дзейнасцю арганізацыі.

Калі праектная прапанова ўключае наступныя тыпы выдаткаў, настойліва рэкамендуецца звязацца з арганізатарамі конкурсу па

электроннай пошце адносна таго, у якой ступені яны могуць быць кампенсаваны: візы і/або страхоўка падарожжаў; любыя віды падпіскі; набыццё абсталявання. Калі ласка, звяртайцеся толькі з канкрэтнымі пытаннямі, бо індывідуальныя кансультацыі ў рамках гэтай праграмы не прадугледжаны.

У межах такіх кампенсацый грантаатрымальнік павінен будзе прадставіць фінансавыя і апавядальныя справаздачы разам з адпаведнымі пацвярджальнымі дакументамі.

Выдаткі, якія перавышаюць агульную зацверджаную суму гранта, не будуць кампенсаваныя.

Выдаткі, не ўключаныя ў зацверджаны бюджэт праекта або тыя, якія не былі асобна зацверджаныя ў пісьмовай форме грантадаўцам, не будуць кампенсаваны.

Выдаткі без належнай пацвярджальнай дакументацыі не будуць кампенсаваны. Звярніце ўвагу, што грашовыя плацяжы, зробленыя наяўнымі за межамі Беларусі, не будуць кампенсаваны, калі гэта не ўзгоднена загадзя з грантадаўцам. Для плацяжоў, зробленых наяўнымі ў Беларусі, будуць патрабавацца дакументы, якія пацвярджаюць асобу атрымальнікаў.

Выдаткі будуць кампенсаваны толькі ў тым выпадку, калі яны былі зроблены на працягу тэрміну рэалізацыі праекта.

## Папярэдні графік плацяжоў для міні і мідзі грантаў

Для праектаў з агульным бюджэтам да 10 000 еўра плацяжы будуць ажыццяўляцца двума часткамі, калі іншае не прадугледжана ў Грантавай дамовай:

- 80% сумы гранта будзе прадастаўлена ў якасці авансу на выкананне актыўнасцяў праекта.
- Да 20% ад зацверджанай агульнай сумы гранта будзе пералічана Грантаатрымальніку пасля зацвярджэння фінальных наратыўнай і фінансавай справаздач у залежнасці ад фактычнай сумы панесеных выдаткаў.

Для праектаў з агульным бюджэтам ад 10 000 еўра да 60 000 еўра, плацяжы будуць ажыццяўляцца трыма часткамі, калі іншае не прадугледжана ў Грантавай дамове:

- 40% ад агульнай зацверджанай сумы гранта прадастаўляецца ў якасці авансу, каб Грантаатрымальнік мог пачаць рэалізацыю актыўнасцяў праекта.
- 40% ад агульнай зацверджанай сумы гранта прадастаўляецца пасля прдстаўлення і зацвярджэння прамежкавых наратыўнай і фінансавай справаздач.
- Да 20% ад зацверджанай агульнай сумы гранта будзе пералічана Грантаатрымальніку пасля зацвярджэння фінальных наратыўнай і фінансавай справаздач у залежнасці ад фактычнай сумы панесеных выдаткаў.

## Грантавая дамова са справаздачай на аснове вынікаў (Outcome-Based Contracting, OBC) — толькі для грантаатрымальнікаў унутры Беларусі

У асобных выпадках адабранаму Заяўніку можа быць прапанаваны кантракт на падставе дасягнення канкрэтных вынікаў. Паводле такога тыпу кантракту аплата ажыццяўляецца толькі пасля дасягнення вызначаных мэтаў.

Звярніце ўвагу: кантракты OBC маюць асобныя патрабаванні да справаздачнасці і правярання бюджэту, якія будуць падрабязна абмеркаваныя перад падпісаннем кантракту.

У большасці выпадкаў для справаздачнасці па гэтым тыпе кантрактаў патрабуюцца толькі падрабязная наратыўная справаздача з дадатковымі пацвярджальнымі дакументамі, якія паказваюць, што запланаваная дзейнасць сапраўды праводзілася. Фінансавая справаздача не патрабуецца ці патрабуецца толькі па асобных бюджэтных радках.

Графікі плацяжоў па гэтым тыпе кантрактаў будуць абмяркоўвацца з кожным заяўнікам індывідуальна. Але агульнае правіла заключаецца ў тым, што ўсе плацяжы будуць ажыццяўляцца ў якасці кампенсацыі за дасягнутыя вынікі. У выпадках, калі вынікі не былі дасягнуты або былі дасягнуты толькі часткова, грантаатрымальнік будзе мець права на атрыманне кампенсацыі, якая прапарцыйна дасягнутаму выніку, а не фактычна выдаткаваным сродкам.
Калі ў вас ёсць пытанні, звязаныя з гэтым тыпам кантрактаў, і вы хочаце даведацца, ці адпавядае ваша праектная ідэя такому механізму фінансавання, калі ласка, сфармулюйце свой запыт у пісьмовай форме і адпраўце яго арганізацыйнай камандзе па электроннай пошце для атрымання больш падрабязнай інфармацыі.

## Суфінансаванне

Гранты могуць пакрываць да 100 % дапушчальных выдаткаў. Суфінансаванне не абавязковае, але вітаецца, калі Заяўнік можа прыцягнуць дадатковыя рэсурсы. Звярніце ўвагу, што любое дадатковае фінансаванне павінна быць пацверджаны (напрыклад, пагадненнем з донарам, выпіскай з банкаўскага рахунку і г.д.) і мусіць складаць не менш за 20% запытанай сумы гранта.

Калі заяўка будзе падтрыманая, перад падпісаннем грантавай дамовы будзе запытана пацвярджэнне сумеснага фінансавання. Акрамя таго, у выпадках, калі ў праекце ёсць суфінансаванне, грантаатрымальнік павінен рабіць справаздачу за ўсю суму цалкам і за ўсе актыўнасці праекта.

Уласныя сродкі (самафінансаванне) не з’яўляюцца суфінансваннем, але могуць быць дадаткова пазначаны ў бюджэце праекта.

## Бачнасць праекту

Для праектаў, што рэалізуюцца па-за межамі Беларусі, патрабаванні да бачнасці абавязковыя, калі іншае не прадугледжана ў грантавай дамове. Дзейнасць і вынікі такіх праектаў павінны мець бачны характар, а ўсе публічныя згадкі пра падтрыманы праект і яго прадукты мусяць утрымліваць інфармацыю пра падтрыманне Еўрапейскім Саюзам у межах праграмы ArtPower Belarus. Тым не менш у выпадку пераканаўча абгрунтаванай неабходнасці, можа быць разгледжаная магчымасць выключэння з гэтага патрабавання.

## Падтрыманне заяўнікаў

Будуць зарганізаваныя інфармацыйныя онлайн-сесіі, падчас якіх будуць разглядацца пытанні ад заяўнікаў, што датычаць гэтага конкурсу праектаў. Сачыце за інфармацыяй на byculture.org і азнаёмцеся з раздзелам “Пытанні і адказы” (Q&A), дзе будуць апублікаваныя часта задаваныя пытанні. Запісы папярэдніх онлайн-сесій даступныя ў Відэабібліятэцы.

Акрамя таго, заяўнікі могуць скіроўваць пытанні ў электронную пошту: info@artpowergrants.org.

## Бяспека

Для гарантавання бяспечнага карыстання электроннай грантавай сістэмай і захавання канфідэнцыйнасці інфармацыі неабходна прытрымлівацца наступных правілаў.

### 1. Ахова персанальных звестак і заяўкі на грант

- Афіцыйныя паведамленні: уся афіцыйная камунікацыя ад грантадаўцы ажыццяўляецца выключна праз электронную грантавую сістэму. Не перадавайце персанальнай інфармацыі: ніколі не перадавайце звестак для ўваходу, персанальных ці фінансавых звестак праз электронную пошту ці тэлефон; рэкамендуецца выкарыстоўваць асобную электронную скрыню для рэгістрацыі; не выкарыстоўвайце паштовых сэрвісаў з даменамі .ru і .by. У адваротным выпадку ваша заяўка можа быць адхілена.
- Асцярожна з падазронымі лістамі: не адкрывайце спасылак, не загружайце файлаў і не перадавайце інфармацыі ў адказ на лісты ад імя грантадаўцы, калі яны выклікаюць падазрэнне.
- Правярайце крыніцу: калі атрымалі падазронае паведамленне, праверце яго, зайшоўшы на старонку электроннай грантавай сістэмы.
- Паведамляйце пра падазроныя дзеянні: пры падазрэнні на фішынг або махлярства неадкладна паведамляйце пра гэта праз электронную грантавую сістэму або афіцыйныя каналы падтрымання.

### 2. Захаванне звестак

- Не захоўвайце звестак для ўваходу на прыладах з агульным доступам.
- Рэкамендуецца выкарыстоўваць асобны электронны адрас, прызначаны толькі для рэгістрацыі ў сістэме.

### 3. Доступ толькі праз камп'ютар

- Рэгістрацыя і праца з заяўкамі мусяць адбывацца выключна з выкарыстаннем камп'ютарных прыладаў.

### 4. Выкарыстанне рэжыму інкогніта

- Адкрывайце электронную грантавую сістэму толькі ў рэжыме інкогніта ў вашым браўзеры – гэта дапаможа зменшыць рызыку захавання кэшу і аўтаматычнай фіксацыі звестак уваходу.

### 5. Абавязковае выкарыстанне VPN

- Калі ваш праект – у Беларусі або частка каманды працуе ў краіне, выкарыстанне VPN – абавязковая ўмова.

### 6. Іншыя меркаванні бяспекі

- Усе дадатковыя патрабаванні да бяспекі будуць абмеркаваныя і ўзгодненыя з адабранымі заяўнікамі падчас заключэння дамовы.

## Ахова персанальных звестак і выкарыстанне вынікаў праекту

Для ўдзелу ў конкурсе Заяўнік павінен даць сваю персанальную інфармацыю камандзе кіравання праграмаю.
У межах праекту ArtPower Belarus будуць апрацоўвацца звесткі, пададзеныя вамі: напрыклад, імя, электронны адрас, тэлефон, дата нараджэння, рэзюмэ ды інш.

Гэтыя звесткі апрацоўваюцца, згодна з Рэгламентам ЕС № 45/2001 аб абароне фізічных асобаў пры апрацоўванні персанальных звестак інстытутамі і органамі ЕС і свабодным перамяшчэнні такіх звестак, а таксама Рэгламентам аб персанальных звестак (GDPR).

Уся інфармацыя, запытаная ў заяўцы, будзе выкарыстоўвацца выключна з мэтай ацэнкі праекту згодна з умовамі конкурсу ArtPower Belarus, і не будзе перадавацца трэцім асобам.

Калі іншае не прадугледжана ў спецыфічных умовах, правы ўласнасці на выніку праекту застаюцца за Заяўнікам(і).


Funded by the European Union
ART POWER BELARUS
DANSK KULTUR-INSTITUT DANISH CULTURAL INSTITUTE
BELARUSIAN COUNCIL FOR CULTURE